# Урывак з аўтабіяграфіі Кандрата Крапівы «Ад маленства да сталасці»

**Т. М. Астроўская,**
настаўнік беларускай мовы і літаратуры
кваліфікацыйнай катэгорыі «настаўнік-метадыст»

«З васьмярых братоў і сясцёр, што нарадзіліся раней за мяне, у жывых засталіся дзве сястры. Адна з іх хутка памерла. Каб застрахаваць мяне ад такога ж лёсу, бабулькі параілі даць мне імя майго бацькі. Так і стаў я на ўсё жыццё Кандратам Кандратавічам. Як бы ўзрадаваліся бабулькі на тым свеце, калі б даведаліся, што я пражыў на свеце ўжо больш за шэсцьдзесят гадоў! І, вядома, палічылі б страшэннай няўдзячнасцю мае сатырычныя вершы пра ўсялякія забабоны!

Дзяцінства вясковага хлопчыка прайшло сваім парадкам. Спачатку насілі ў калысцы на поле, пасля сам хадзіў, ухапіўшыся за матчын падол, потым пасвіў свіней і кароў, а ў чатырнаццаць пайшоў за плугам і за касой.

Прыходзілася і цяжка часамі, але я з удзячнасцю ўспамінаю сваіх бацькоў, якія навучылі мяне працаваць яшчэ ў маладым узросце, навучылі цаніць працу і паважаць людзей з мазольнымі рукамі.

У сем гадоў я пачаў вучыцца ў царкоўнапрыходскай школе і за чатыры гады паспяхова яе скончыў. Неўзабаве ў сям'і здарылася вялікае гора – памерла маці. Бацька, Кандрат Міхайлавіч, разважыў, што без гаспадыні ніяк нельга і ажаніўся другі раз, а мяне вырашыў «вывесці ў людзі», даўшы адукацыю. Пасля гадавога перапынку я прадоўжыў вучобу спачатку ў народным вучылішчы ў мястэчку Узда, а потым у гарадскім чатырох-класным вучылішчы ў мястэчку Стоўбцы Мінскай губерні. Да гэтага часу адносяцца першыя «пробы пяра» – лірычныя вершы з налётам «сусветнай тугі» і эпіграмы на знаёмых. Адзін твор «высокага класа» я паслаў у часопіс «Жизнь для всех» і атрымаў адказ, што верш не можа быць надрукаваны, бо ён не мае дастатковай мастацкай каштоўнасці. Пасля гэтага не браўся за пяро восем гадоў, бо палічыў гэта марнай справай.

З асалодай чытаў творы і тады ўжо слаўных беларускіх паэтаў Янкі Купалы і Якуба Коласа. Раней у мяне не было такой магчымасці. Знаёмства з беларускімі класікамі канчаткова пераканала мяне, што добрыя творы можна пісаць і на беларускай мове. А ёю я валодаў лепш, чым рускай».

## Урывак з успамінаў жонкі паэта Уладзіміра Дубоўкі Марыі Дубоўкі «Мае санаторыі і курорты»

«З Уладзімірам Мікалаевічам мы пазнаёміліся ў Беларускім клубе, куды нас, настаўнікаў-беларусаў, запрасілі займацца беларускай мовай. Кіраваў

гэтымі заняткамі Уладзімір Мікалаевіч. Пасля заняткаў мы з ім падоўгу блукалі па Маскве, дакладней, ён праводзіў мяне, а дарога ад Арбата да Старой Сіманаўкі далёкая. Хадзілі мы па тэатрах, канцэртах, потым пажаніліся, і пачаўся новы перыяд майго жыцця, нераздзельны ад яго лёсу.

20 ліпеня 1930 года Уладзімір Мікалаевіч быў арыштаваны першы раз. Яго арыштавалі на працы ў Крамлі ў Саўнаркоме. Дзень быў гарачы, на працу ён паехаў у белым касцюме і сандалях. Так яго і забралі.

Страшна. Жыць страшна. Самота. Старасць. Бездапаможнасць. І ўспамінаюцца таксама страшныя перыяды жыцця. Вельмі страшны перыяд — Шэшурга. Адна з маленькім дзіцем у глухім далёкім сяле. 1933 год. Цяжкі год. Пакуль з Уладзімірам Мікалаевічам — нічога. Усе ж удваіх. Ён умеў прыстасоўвацца да жыцця ў самых цяжкіх умовах.

У ліпені 1937 года Уладзіміра Мікалаевіча зноў арыштавалі, усё ператрэслі, забралі ўсё, што было напісана яго рукой, у тым ліку і «Чайльд Гарольда» Байрана на беларускай мове. З сабою ён узяў змену бялізны і сухары. Павялі яго. Запомнілася мне яго спіна, якая аддалялася, і двое канваіраў. Так запомнілася, што я доўга не магла ўявіць сабе ягоны твар, перад вачамі ўсё уставала спіна і два канваіры…

… Уладзімір спачатку працаваў у матэрыяльным аддзеле, потым перайшоў на разліковы стол, прайшоў усе аперацыі, праявіў сябе здольным і працавітым работнікам і зарэкамендаваў сябе як чулы, добры чалавек. Напрыклад, калі да яго звяртаўся нехта з сяла (стары або старая), ён не пасылаў яго або яе хадзіць ад стала да стала, з пакоя ў пакой, а рабіў усё сам са сваімі памочнікамі і прыносіў усё гатовае, а наведвальніка на гэты час садзіў на крэсла, а не прымушаў стаяць у чаканні.

Адносіны на працы і да яго, і да мяне былі вельмі добрыя. І вось аднойчы сяджу я дома, рыхтуюся да даклада на педсавеце, заходзяць Уладзімір Мікалаевіч, дырэктар саўгаса і нейкі вайсковец. Я не вельмі разбіраюся, а дакладней, зусім не разбіраюся ў формах і знаках, і не зразумела, што гэта начальнік МДБ. Я думала, што прыйшлі паглядзець, як жыве паднаглядны, запрапанавала сесці. Уладзімір Мікалаевіч кажа мне: «Ну, збірай мяне ў дарогу». Я анямела: «У якую дарогу, куды?» Разгубілася і ўсё яшчэ не разумею сэнсу гэтага візіту. Калі ўрэшце да мяне дайшло, што гэта арышт, я злосна запытала начальніка: «За што ж цяпер?» Ён растлумачыў, што ніякай новай справы няма, што ёсць распараджэнне Масквы, яно датычыць усіх, хто быў у лагерах. Не памятаю, як я збірала, дапамагаў мне сам начальнік, таму што бачыў, што я дрэнна арыентуюся. «Ну, пойдзем, праводзім», — кажуць мне. Мы пайшлі ў напрамку сталоўкі. Там стаяла машына. Ага, у хаце яшчэ начальнік мне сказаў: «Вось бачыце, я прыехаў без вартавых, асабіста. Я ведаю, які гэта чалавек».

Тады ён расказаў Уладзіміру Мікалаевічу, што Зіначка патанула, купаючыся ў рэчцы ў піянерскім лагеры. Уладзіміра Мікалаевіча гэта так уразіла, што ён доўгі час не мог узяць сябе ў рукі, але потым усё ж сабраўся з сіламі, пайшоў да маці, паплакалі яны разам, з'ездзілі на могілкі. Купіў

Уладзімір Мікалаевіч вянок, зрабіў падарунак маці. Вось і ўсё. Гэтую дзяўчынку ён часта ўспамінаў, усё збіраўся напісаць, ды так і не сабраўся.

Будаваць свой домік трэба было. Дасталося Уладзіміру Мікалаевічу вельмі цяжка. Будаваў у часы да працы ў сталярнай майстэрні і пасля працы, гэта значыць, увесь светлы час сутак. А будавалі мы за ручаём, так што на кані пад'ехаць было нельга, пад'езду не было. Да гэтага часу памятаю крывавыя рубцы на яго плячах ад пераноскі па кладцы праз ручай цэглы на рускую печку, падтопак і пліту. Бывала прыходжу дамоў са школы і бачу па ўсім, што абедаць ён не прыходзіў. Я збіраю сёе-тое, нясу на будоўлю, а ён толькі бурчыць: «Калі мне абедаць? Працаваць трэба, ты толькі час у мяне адымаеш, адцягваеш увагу». Я ўжо маўчу.

Увесь час Уладзіміра Мікалаевіча праходзіў за цяжкай працай, акрамя майстэрні. Была і іншая праца, нібы і лягчэйшая, але якая патрабавала цярплівасці, упартасці і настойлівасці. Яму хацелася, каб домік наш выглядаў прыгожа, таму налічнікі аздабляў выпіленымі з фанеры і размаляванымі ўзорамі. Выпільванне патрабуе вялікай цярплівасці, і яе ў яго хапала. Нават ваконца на гарышчы ён упрыгожыў.

І ўсё ж ён быў дужэйшы за мяне, і я не магла думаць, што перажыву яго, і вось ужо другі год жыву. Праўда, кажуць, рыпучае дрэва жыве доўга. Хутка Новы. Гэта для яго быў асаблівы час. Дзеці-малышы, сустракаючы яго на вуліцы ці ў аўтобусе, прынімаюць за Дзеда Мароза (белая барада, ружовы твар): «Мамачка, паглядзі, Дзед Мароз жывы». У яго заўсёды ў кішэнях цукеркі, а ў гэты перыяд ён ужо асабліва стараўся, каб мець пры сабе нешта смачнае: цукеркі, апельсіны, яблыкі, мандарыны, і ў такіх выпадках адорваў дзетак, і яны маме ці бабулі хваліліся: «Гэта мне Дзед Мароз даў».

**Урывак з аўтабіяграфіі Анатоля Вярцінскага «На скразняках гісторыі»**

Калі мне прапанавалі ў выдавецтве напісаць аўтабіяграфію – я даў згоду. Але потым зразумеў, што не змагу гэта зрабіць. Некалькі разоў я браўся за справу і столькі ж разоў адкладваў яе. Адзіным рэальным вышкам было тое, што я больш-менш усвядоміў, у чым тут справа, што перашкаджае мне брацца за свой «жыццяпіс». Па-першае, як я зразумеў, дае тут аб сабе знаць маральнае пачуццё, пэўнае маральнае перакананне. Адна справа ўспомніць перажытае ў размове з сябрам, у споведзі перад блізкім чалавекам. Адна справа напісаць кароткую аўтабіяграфічную даведку для

аддзела кадраў. У першым выпадку ты натуральна, па чалавечы раскрываеш сваё сэрца, у другім – ты выконваеш неабходную фармальнасць. І зусім іншая справа пісаць сваю біяграфію таму, што яна мае нібыта нейкае асаблівае, у адрозненне ад усіх зямных, смяротных, значэння.

… Божа! Колькі шкоды прынёс усім нам гэты метад — патрабаваць ад вучня ці

студэнта, каб ён ведаў, дзе і калі нарадзіўся пісьменнік, як звалі яго бабулю, калі ён надрукаваў свой першы твор і як гэты твор называўся. І калі б гэта патрабавалася ў другую ці трэцюю чаргу. А так жа ацэнка па літаратуры ставілася менавіта за такія вось веды, за здольнасць завучыць факты і даты, за зуброжку. Не, не біяграфіі

павінны штудыравацца ў школах, а сама літаратура, самі творы павінны вывучацца.

…Вопыт... Здаецца, гэта і ёсць тое слова, якое доўга трымцела на кончыку пяра і якое, знайшоўшыся, прымушае мяне затрымацца і сказаць, замест аўтабіяграфіі, яшчэ некалькі слоў. Пра вопыт свайго пакалення. У кожнага пакалення – свой, непаўторны, толькі яму ўласцівы вопыт. Але вопыт вопыту не роўны. Ён можа быць больш бедны і больш багаты, аднастайны і разнастайны – у залежнасці ад гістарычных абставін і грамадскіх умоў. Маё пакаленне – я маю на ўвазе равеснікаў, чыя біяграфія ў асноўным супадае а маёй, – не можа паскардзіцца на беднасць вопыту, на беднасць уражанняў і назіранняў, не можа сказаць, што яно, у гэтым сэнсе, прыйшло занадта рана або занадта позна. Калі акідваеш мысленным позіркам жыццёвы шлях, перабіраеш у памяці мінулае, то проста дзівішся, як многа ўбачана і пережыта, які складаны і разнастайны вопыт у твайго пакалення – гістарычны, сацыяльны, маральны і г. д.Хаця мы і маем вышэйшую адукацыю і наша літаратурнае

пакаленне называюць часам «філалагічным», мы тым не менш дыялектыку вывучалі сапраўды не па Гегелю. Мы сёння фарсім у модных штанах самых розных фірмаў, айчынных і замежных, і ў той жа час мы яшчэ ведаем, што такое саматканыя штаны і аўчынныя кажушкі. Мы яшчэ помнім – памяццю цела – іх цяпло.

Мы бачылі мір. Родны вясковы мір. (Хораша ўспамінаецца перадваенная вёска – зялёная, сонечная, узрушаная.) І мы бачылі вайну – самую крывавую ў чалавечай гісторыі. (Шмат што запомнілася, але, як самыя цяжкія камяні, леглі на дно памяці забітыя – чорны труп партызана на белым снезе, зялёны труп немца каля шашы...) Мы ведаем, як войны пачынаюцца, як праводзяць на вайну мужчын, і мы ведаем, як войны канчаюцца і як вяртаюцца дамоў салдаты. Нашы бацькі былі салдатамі, нашы маці – салдаткамі. Мы ведаем вёску – мы ў ёй нарадзіліся і жылі да ад'езду на вучобу. І мы ведаем горад – мы ў ім зараз жывём. Мы можам параўноўваць, мы можам бачыць розніцу. Дзьмуў вецер часу, дзьмулі скразнякі гісторыі, мяняліся жыццёвыя абставіны. І мы маглі бачыць, як паводзяць сябе ў тых ці іншых абставінах людзі, як яны мяняюцца разам з абставінамі. Мы пазнавалі чалавечую прыроду і прыроду чалавечага грамадства. Мы можам, нарэшце, сказаць, не рызыкуючы быць нясціплымі, што мы ведаем, што гэта такое – народ. Для нас ён – не гучнае слова і не тэрміналагічная абстракцыя. Для нас ён – жывая рэальнасць. Не нарадзіся мы ў вёсцы і не пераджыві разам з ёй вайну і іншыя нягоды – мы б гэтага не маглі сказаць. У нас жа такі вопытёсць, мы бачылі людскую сілу і людскую стому, людскія радасці і людскія пакуты, людскі адчай і людскую надзею, і ўсё гэта засталося ў нашай крыві і плоці як жывое пачуццё народа, народнага лёсу. … Словам, на рахунку майго пакалення багаты вопыт. Мы шмат ведаем, бо шмат бачылі. І гэты вопыт абавязвае нас кожнага, хто ўзяўся аднойчы за пяро, быць мудрымі, праўдзівымі і неспакойнымі, быць вернымі самім сабе, свайму часу і свайму народу. Гэты вопыт абавязвае нас, іншымі словамі, імкнуцца яшчэ лепш і больш бачыць.

У мяне такое ўражанне, што мы як літаратары ў вялікім даўгу перад сваім вопытам, вопытам свайго пакалення. Мы яшчэ як бы не можам выбрацца з-пад яго грузу, не можам узняцца над ім, знайсці для яго асэнсавання адпаведныя мастацкія сродкі. Калі ж мы зможам гэта зрабіць, тады, магчыма, мы і напішам свае лепшыя, вартыя сапраўднага прызнання творы.. І гэтыя творы будуць лепшай нашай аўтабіяграфіяй. Бо як бы не было дадзена мастаку пераўвасабляцца, якую б ролю не адводзіў ён сабе ў сваіх творах, ён павінен тым не менш заставацца самім сабой, увасабляць сваю любоў і сваю нянавісць, свой вопыт».